4. Хроника освобождения в кино- и фотодокументах [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://yandex.by/turbo?text=https%3A%2F%2Fwww.sb.by%2Farticles%2Fkhronika-osvobozhdeniya-v-kino-i-fotodokumentakh.html. – Дата доступа: 17.03.2019.
5. Центральная студия документальных фильмов. История и люди в документальном кино [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://csdfmuseum.ru/names. – Дата доступа: 25.03.2020.

## АДМЕТНАСЦЬ ВЫЯЎЛЕННЯ АРХЕТЫПАЎ У ТВОРАХ ПРА ВАЙНУ

***Т. Ф. Сухоцкая,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*
*дацэнт кафедры культуралогіі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванне архетыпных асноў культуры ўпісваецца ў сучасныя парадыгмы культуралогіі, у цэнтры вывучэння якіх знаходзяцца такія ўзаемавыключныя паняцці, як міфалагічная свядомасць, культура, ментальнасць. У апошнія гады назіраецца ўвага да архетыпаў у кантэксце выяўлення канстантаў культуры, што абумоўлена іх значнасцю ў фарміраванні духоўнай спадчыны чалавецтва. Архетыпы ўяўляюць сабой абагульнены вопыт жыццядзеяння калектыўнага суб'екта гісторыі, які адлюстраваны праз сістэму культурных сімвалаў і вобразаў. Ён садзейнічае аб'яднанню грамадства, уплывае на фарміраванне менталітэта народа, захоўвае вызначаныя стэрыатыпы мыслення і паводзін. Беларуская культура праз тэксты на ваенную тэматыку выявіла адметнасць экзістэнцыяльнага светапогляду, асновай якога стала пераасэнсаванне каштоўнасных арыенціраў, магчымасці выбару асобай уласнай мадэлі паводзін, скіраваных на пазнанне і ўзвелічэнне духу чалавека як суб'екта гісторыі, сцверджанне ўнікальнасці яго зямнога жыцця. У творах В. Быкава, А. Адамовіча, М. Савіцкага і інш. сфарміраваўся экзістэнцыяльны псіхалагізм як цэласная эстэтычная сістэма, якая актуалізуе глыбінныя сэнсы мікрадэталяў, мікраабставін, архетыпных вобразаў. Канцэптуальна арганізаваная культурная прастора сведчыць аб арганічным спалучэнні ў стылі беларускай культуры ХХ ст. рэалістычнага і экзістэнцыянальнага кантэкстаў. Здольнасць асобы існаваць на мяжы маральных сітуацый адкрыла перспектыву спасцігаць таямніцы быцця, чалавечай індывідуальнасці у паліфаніі грамадскіх сувязяў.

Калектыўнае несвядомае выступае асновай фарміравання асабістага і калектыўнага вопыту чалавецтва, яго культурнай памяці. Яно перажываецца ва ўніверсальных псіхічных формах, якія праяўляюцца ў паводзінах як калектыўнага, так і індывідуальнага суб'екта культуры. У сучаснай культуры адлюстраваны працэсы разбурэння архетыпаў, што выяўляецца праз дэструктыўныя мадэлі паводзін асобы, нарастанне псіхічных захворванняў і разбурэнне культурнай ідэнтычнасці. Крывавыя канфлікты, якія сталі нормай сучаснай цывілізацыі, вымушаюць звярнуцца да культуралагічнага асэнсавання архетыпаў як устойлівых матрыц у мастацкай спадчыне пра вайну, якая здольная даць высокія арыенціры духоўнасці, імунітэт супраць антыгуманнай жыццядзейнасці. Выяўленне архетыпаў і раскрыццё іх сэнсаў у творах пра Вялікую Айчынную вайну будзе садзейнічаць як патрыятычнаму выхаванню маладога пакалення, так і яго здольнасці адстойваць мірны шлях развіцця сучаснай цывілізацыі.

На падставе культуралагічнага аналізу ваенных тэкстаў можна гаварыць пра іх архетыпную структуру і выяўленне дамінуючых архетыпных вобразаў вайны. Пры гэтым архетып разумецца з пазіцый К. Юнга як форма без зместу, якая прадстаўляе толькі магчымасць пэўнага тыпу ўспрымання і дзеяння, як своеасаблівыя кагнітыўныя вобразы [1, с. 195].

Архетып функцыянуе пры ўмове немагчымасці існавання або адсутнасці свядомых паняццяў. Ён – сукупнасць духоўна-культурных сімвалаў, вобразаў этнічнага быцця, з дапамогай якіх жыццё чалавека напаўняецца пачуццямі, сэнсам і мэтазгоднасцю. Архетып не перадаецца сродкамі мовы, традыцыямі, міграцыямі. Ён складае змест калектыўнага несвядомага, з якім нараджаецца чалавек, і прысутнічае у снах і марах.

Любы архетып мае вялікую колькасць сімвалічных рэпрэзентацый, якія вызначаюцца культурнымі або асабістымі фактарамі. Аднак архетыпная форма з'яўляецца адзінай і ўніверсальнай. У творах на ваенную тэматыку назіраецца канстантнасць фазаў развіцця падзей, а часавыя змяненні з'яўляюцца плаваючымі. Паўторныя сімвалы як матэрыяльны або духоўны аб'ект і сімвалы-дзеянні ў асноўным страчваюць першапачатковае значэнне і канкрэтнае прызначэнне, бо змяняюцца знакі экзістэнцыянальнай сітуацыі і іх адлюстраванне ў кампазіцыі, фігурах, рухах.

Дамінантным архетыпам у творах пра вайну выступае Агонь. У цеснай сувязі з першаэлементамі Зямлі, Вады і Паветра ён выступае першаасновай быцця. Анталагічная семантыка выяўляецца ў імкненні захавання чалавечага роду. З пазіцый культуралагічнаг падыходу агонь разглядаецца як сацыякультурны феномен, які выяўляе сваю полісемантычнасць і амбівалентнасць у розных формах культуры. Вобраз «вогненнай вёскі» стаў эмблемай Беларусі ў гісторыі Найноўшага часу. Экс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прэсіўная функцыя агню адлюстравана ў карцінах цыклу «Лічбы на сэрцы» М. Савіцкага, у скульптурных кампазіцыях Хатыні, Жодзінскага мемарыялу. У XX ст. архетып агню выяўляецца праз сімволіку смерці і разбурэння, фарміруе трагедыйны канон у беларускай культуры. Нягледзячы на амбівалентнае выяўленне вогненай семантыкі, яна вызначаецца цэласнасцю, адзінствам супрацьлеглых узаемадапаўняльных пачаткаў, скіравана на пазначэнне каштоўнасных кампанентаў чалавечага жыцця.

Вызначальным архетыпам ў мастацкіх тэкстах пра вайну зяўляецца архетып Героя. Натуральнае асяроддзе для архетыпа – поле бітвы, спаборніцтвы, месца, дзе цяжкасці або выклікі патрабуюць мужных і энергічных дзеянняў. Герой імкнецца перарабіць свет да лепшага. У глыбіні душы ён баіцца пацярпець паразу, не выстаяць да канца і не перамагчы. Гэты архетып выхоўвае ў людзей дысцыпліну, засяроджанасць, рашучасць, мэтанакіраванасць. Адзенне і навакольнае асяроддзе Героя функцыянальныя, пазбаўлены раскошы. Занадта вялікі камфорт успрымаецца як небяспека, бо можа размягчыць чалавека. Актывізацыя архетыпа Героя праяўляецца праз яго імкненне да славы і гатоўнасці прыняць кінуты выклік, абараніць слабых. Амбівалентнасць архетыпа праяўляецца як праз здзяйсненне вялікіх ідэй, так і праявамі фанабэрыстасці, жорстскасці, вечным пошукам ворага.

Архетып героя ў беларускай культуры найбольш разнастайна адлюстраваны ў творах Васіля Быкава. У яго творах архетып Героя выяўлены праз вобразы лейтэнантаў, простых салдат, жанчын, дзяцей, настаўнікаў (вобраз старшыні Карпенкі з «Жураўлінага крыку», артылерыста-наводчыка Шчарбака са «Здрады», Лазняка з «Трэцяй ракеты», лейтэнанта Клімчанкі з «Пасткі», сяржанта Іван Цярэшкі з «Альпійскай балады» і інш.). Шараговыя вайскоўцы, лейтэнанты, апынуўшыся ў экстрэмальных умовах, выяўляюць у сваіх дзеяннях сапраўдныя духоўныя каштоўнасці. У знешняй будзённасці пісьменнік умее высвятліць складаны і рэзкі паварот, які выклікае ў героя найвышэйшае праяўленне чалавечага духу, або няздольнасць вынесці выпрабаванне, якое вядзе да маральнага самазнішчэння чалавека. Аўтарскі герой – асоба, якая здольная думаць, перажываць, пакутаваць, адчуваць, а значыць здольная зрабіць свой выбар. Героі Быкава разумелі, што гэта іх апошні рубеж, але з годнасцю глядзелі ў твар смерці, таму што баранілі родную зямлю. Пісьменнік выступае супраць абсурднай смерці, нават калі яна мае самы гераічны пачатак, але нічога не вырашае ў глабальных маштабах. Чалавечае зямное жыццё – найвялікшая каштоўнасць.

Неад'емнай часткай ў творах пра вайну з'яўляецца архетып маці. Па Юнгу, ён прысутнічае ў топасах, якія сімвалізуюць выратаванне (рай, царства божае), рэчах, якія выклікаюць у чалавека «глыбокую павагу»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(царква, універсітэт, краіна, неба, зямля, лясы, мора, месяц). Архетып маці сімвалізуе багацце і ўрадлівасць. Ён можа быць звязаны са скалой, пячорай, дрэвам, вясной, крыніцай. Дзякуючы сваёй ахоўнай функцыі сімвалам маці можа з'яўляцца мандала. Архетып Маці мае мноства праяў. Гэта можа быць маці, бабуля ці маці ў пераносным сэнсе слова – багіня.

У беларускай культуры архетып маці выяўляецца і праз вобраз-сімвал дзяўчынкі-маці, створаны ў творах Кузьмы Чорнага (Насцечка Вялічка ў рамане «Вялікі дзень», Зося і Ірынка Назарэўская ў «Трэццім пакаленні» і інш.). Па глыбіні семантыкі ён раўназначны купалаўскаму вобразу Маладой Беларусі, багдановічаўскай Мадонне, што блізкія архетыпу Дзевы Марыі.

Архетып маці з’яўляецца базісным у творчай спадчыне Міхаіла Савіцкага: аўтарытэт усяго жаночага, мудрасць і духоўная вышыня. Варта адзначыць, што негатыўны аспект дадзенага архетыпу ў беларускай культуры не выяўляецца, таму што культ маці – дамінантны ў народнай культуры. У кантэксце гэтай каштоўнаснай сістэмы і тварыў мастак (карціны «Куст руж», «Партызанская мадонна», «Мінская мадонна», «Мадонна Біркенау» і інш.). «Чарнобыльская мадонна» з’явілася вяршыняй выяўлення ўсіх душэўных пакут М. Савіцкага. У маці нараджаецца мёртвае дзіця, забітае радыяцыяй, нявіннае, безабароненае. Два царскіх чорнакрылых анёлы ласкава прымаюць неўмаля з рук маці. Мастак стварыў нацыянальную Пьету, дзе простая беларуская жанчына ўвасабляе Багародзіцу, а мёртвае неўмалятка – Хрыста.

Варта адзначыць, што ў масавай культуры архетып маці, як правіла, выяўляецца з процілеглым сэнсам, што сведчыць пра яго разбурэнне. У мастацкай літаратуры і кінематографе ён выраджаецца ў стэрыатып і становіцца асновай для з’яўлення стэрыатыпных персанажаў, тэм і сімвалаў (Д. Браўн, Д. Туі, Э. Брэвіг). Аднак назіраецца і настальгія асобы па страчанай гармоніі з быццём (К. Венегут, Р. Брэдберы, Дж. Камеран). На амбівалентным фоне постмадэрнізму архетып «Вялікай Маці» аказваецца надзвычай актуальным.

Такім чынам, неабходна адзначыць, што беларуская культура з яе спрадвечнай цікавасцю да каштоўнасцей зямнога існавання паказала вайну як трагічна-варожую рэальнасць чалавечаму быццю з яго вітальнымі імкненнямі, дзе існуюць толькі смерць, жах, боль. Трагедыйны канон ў творах на ваенную тэматыку выяўляецца праз зварот да архетыпных вобразаў і сімвалаў, паказвае разбурэнне іх каштоўнага сэнсу ў часы цывілізацыйных катаклізмаў.

---

1. *Юнг, К. Г.* Архетип и символ / К. Г. Юнг. – М. : «Ренессанс», 1991. – 398 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ